
ІНФАРМАЦЫЙНАЯ КУЛЬТУРНА-ГРАМАДСКАЯ ГАЗЕТА ГАРАДОЧЧЫНЫ



ГАСЦІНЕЦ

Еўропу будуем разам тут!

N 4(38), ТРАВЕНЬ 2005 ГОДА

У першым квартале аматары алкагольных напояў дасягнулі раней нечуванай лічбы — праз афіцыйна улічаную сетку гандлю набылі напояў на суму больш аднаго міль-ярда рублёў — 1018 млн. руб.

➢СТАР. 2

"Чарговай правакацыяй" назваў лідэр АГП Анатоль Лябедзька кампанію, якую разгарнулі дзяржаўныя мэдыі вакол зброі, якую знайшлі пад Менскам і Берасьцем. Між тым, афіцыйныя крыніцы ў міліцыі і КДБ гэтых зьвестак не пацьвярджаюць.

➢ СТАР. 3

ДЖОРДЖ БУШ: "АДЗІНАЯ ЗЬДЗЕЛКА, ЯКУЮ Я ЛІЧУ НЕАБХОДНАЙ ДЛЯ БЕЛАРУСІ – ГЭТА ЗЬДЗЕЛКА СВАБОДЫ"

➢ СТАР.4

ПРАКУРОР ПАПРАСІЎ ДАЦЬ ПА 3 ГАДЫ "ХІМІІ" ЛІДЭРАМ АПАЗЫЦЫІ

➢ СТАР. 5

БЫЦЬ ЗГУРТАВАНЫМІ І САЛІДАРНЫМІ

Гэтыя простыя словы прыходзяць на розум, калі пачынаеш аналізаваць асобныя сітуацыі нашага жыцця. Для беларусаў жыццё па СМІ і рэальнае жыццё, як сказалі б у Адэсе, дзве вялікія разніцы. За карамельнай прапагандай стабільнасці і дасягненняў, як за туманам, схаваны нарастаючыя праблемы паўсюдзённага жыцця простага люду. З асобных падзей звычайных людзей складваецца наша самаадчуванне, наша жыццё.

Прайшоў год масавага заключэння кантрактаў і ў будаўнічай арганізацыі не працягнулі кантракты з 10 работнікамі. Пераважна гэта пенсіянеры, але сярод іх апынуўся і мужчына з чатырмя дзецьмі на руках. І ніякі прафсаюз, ніякі суд не паўстаў на яго абарону перад наймальнікам, бо такое стала працоўнае права, што работнік беззабаронны перад наймальнікам.

У бюджэтнай арганізацыі Пагадненнем былі устаноўлены дні выдачы заробку да 10 дня наступнага месяца. Але па жаданню наймальніка, гэтыя дні перасунаты да 19. Зразумела, што пры гэтым пасля 15 ужо даводзіцца плаціць пеню па камунальных плацяжах. Толькі ўсё спакойна ў Багдадзе. Прыкормлены прафсаюз, як сказалі б бальшавікі — жоўты, ніяк на гэта не рэагуе. Ёсць у яго згодны на ўсё актыў. А шэраговым сябрам на гэта перпендыкулярна. Як у анекдоце — яны гатовы спытаць: "А вяроўку з сабой прыносіць?"

Ідзе чарговая кампанія супраць прыцягнення бацькоўскіх грошаў у школу. Выдадзены адпаведныя цыркуляры, дадзены распіскі класнымі кіраўнікамі. Але настаўніца выпадкова, мусіць стаміўшыся ад шторма розных папер, параіла сваім вучням не рваць на апошні званок кветкі з клумбы. Бо пасля апошняга званка са школьнай клумбы знікаюць першыя кветкі — цюльпаны. Але пільныя бацькі на гэта зрэагавалі званком у аддзел. І што тут пачалося! Налёт на збянтэжаную настаўніцу завяршыўся патокам слоў, якія далі б фору лексікону грузчыкаў на аптовай базе. Нашы сеяцелі высокага, чыстага, вечнага атрымалі чарговы урок хамства, якое іржой раз'ядае грамадства. Зноў даведаліся, што праў той у каго больш праў.

І сумна, што людзі маўкліва зносяць здзекі існай бюракратычнай сістэмы, якая павінна бараніць іх інтарэсы, бо з'яўляецца слугой народа. Толькі не ў нас. А каб было па-людску, трэба мець мужнасць для адпору. Хамству, вар'яцтву асобных чыноўнікаў. На гэта могуць быць здатны, толькі арганізаваныя грамадзяне. Жыццё пачынае фарміраваць патрэбу ў згуртаваных, салідарных дзеяннях грамадзян. На заводзе, арганізацыі, школе, бібліятэцы. На вуліцы, дома. Да гэтага абавязкова трэба саспець. Каб людзьмі застацца. А не малпамі на дрэвах.

Менавіта так ахарактарэзаваў наш лад жыцця адзін з афрыканскіх ухажораў праз Інтэрнэт, калі пазнаёміўся з жыццём сваёй каханкі ў сапраўднасці. І накіраваўся да хаты, шкадуючы грошаў на палёт.


Леанід Гаравы.

НАШЫ НАВІНЫ Ў INTERNET

Шаноўныя чытачы газета "Гасцінец" маюць магчымасць пазнаёміцца з нашымі навінамі на інфармацыйным сайце www. hasciniec. org, дзе прадстаўлены матэрыялы выданняў паўночна-усходняй часткі Віцебшчыны з Бешанковіцкага, Гарадоцкага, Віцебскага і Шумілінскага раёнаў. На сайце вядзецца апытанне наведвальнікаў па надзённых праблемах грамадскага жыцця Беларусі, аналітычныя артыкулы сталых аўтараў незалежных СМІ. Для зацікаўленых асоб прадстаўлена інфармацыя пра беларускі аналаг украінскага руху "ПАРА", які мае назву "ЧАС" і адпаведны сайт www. svaboda2006.org з яго праграмнымі дакументамі.

Вынікі апошняга апытання на сайце www.hasciniec.org

Як Вы ацэньваеце ўвагу міжнароднай супольнасці на стан дэмакратыі ў Беларусі?



Усяго адказаў: 17

Наша жыццё

САМЫ ВЫБІТНЫ БЕЛАРУСКІ СПАРТСМЭН

Такое пытанне напрыканцы красавіка задавалі вучням школ Гарадка, калі вывучалі іх стаўленне да здаровага ладу жыцця. На дзіва настаўнікаў фізкультуры, галоўным канкурэнтам для Аляксандра Мядзведзя і Уладзіміра Парфяновіча — шматразовых алімпійскіх чэмпіёнаў стаў... Аляксандр Лукашэнка. Ягоная гульня у хакей і катанне на лыжаролерах з дапамогай дзяржаўных СМІ і ідэалагічнай апрацоўкі у школе вынесла экс-дырэктара саўгаса ў эліту беларускага спорту.

Застаецца толькі дзівіцца — чаго магчыма чакаць ад вучняў пры адказах на пытанне: "Хто лепшы бацька краіны?" І гэта яшчэ не канец.

ЦІ ЗНОЙДЗЕЦЦА АЎТОБУС?

Гэта пытанне зараз павінна хваляваць юных футбалістаў Гарадка, якія перамаглі на занальных спаборніцтвах на призы "Скураны мяч". Перамога над юнымі футбалістамі Лёзненскага Віцебскага і Шумілінскага раёнаў забяспечыла выхад у абласны фінал. Але ці атрымаецца зноў пракол з прыбыццём на фінал залежыць ад старшыні райвыканкама. Юнакі і іх бацькі спадзяюцца, што гарадоцкія футболісты атрымаюць шанец пазмагацца за выхад у рэспубліканскі фінал.

БЕРАГЧЫ ЛЕС АД ПАЖАРУ

Імкнуцца працаўнікі Гарадоцкага лясгасу. Кожны год прадпрыемства праводзіць шэраг супрацьпажарных мерапрыемстваў: ад вырабу плакатаў і аншлагаў у колькасці 300 асобнікаў да набыцця 5 імпартных мотапомп з камплектамі пажарных рукавоў. Наогул, для мэтаў пажаратушэння набыта 4 аўтамабіля, 8 прыцэпных ёмістасцей і абсталяваны дзве пажарна-назіральныя вежы. У камплекце з 32 рацыямі "Матарола" гэта робіць гарадоцкіх ляснікоў мабільнымі ў барацьбе з пажарамі ў лесе

Падрыхтаваў Алесь Шчупак.

Гарадоччына

ЁСЦЬ МІЛЬЯРД!

У першым квартале аматары алкагольных напояў дасягнулі раней нечуванай лічбы — праз афіцыйна улічаную сетку гандлю набылі напояў на суму больш аднаго мільярда рублёў — 1018 млн. руб. На жаль, у сістэме гандлю не вядзецца віншаванне пакупнікоў, якія набылі бутэльку, паклаўшы у касу першыя рублі на другі мільярд прыбыткаў ад алкаголю. Магчыма гэта стала б штуршком да пэўных дзеянняў па абмежаванню гандлю белай смерцю. Пры гэтым трэба узгадаць, што нарастаюць тэмпы барацьбы з незаконным гандлем спіртнымі напоямі, што не можа не весці да павялічэння прыбытку у казну. Толькі ці трэба гэтым прыбыткам радавацца?

ТЭМПЫ СМЯРОТНАСЦІ НАРАСТАЮЦЬ

Ускладненне дэмаграфічнай сітуацыі адбываецца з кожным годам. І калі раней смяротнасць была вышэй нараджальнасці ў 2-3 разы, то апошнім часам смяротнасць стала вышэй нараджальнасці ў чатыры разы: пры 32 навароджаных у раёне памерла 128 чалавек — амаль на сто больш. Такіх несуцяшальных лічбаў не было і ў часы нямецка-фашысцкай акупацыі.

НА КОНЕЙ СПАДЗЯВАННЯЎ УСЁ МЕНШ

Пасля дзесяцігоддзя росту статку коней на гарадоччыне пачаўся перыяд іх скарачэння. І калі на захадзе коні пераважна выкарыстоўваюцца для адпачынку, то на пос-тсавецкай прасторы яны былі яшчэ рабочай сілай. Але расцягванне былых калгасных трактароў па прыватных падворках зрабілі апрацоўку прыватных надзелаў канямі не эфектыўнай справай. Атрымаць прыбытак магчыма на плошчы 2-3 гектара, але апрацаваць такую плошчу без трактара немагчыма. Вось і скарачаецца конскі статак — за мінулы год ён скараціўся на пятую частку і склаў 341 галаву, што на 86 менш папярэдняга году.

ГАРАДОК — ЦЭНТР БОДЫБІЛДЫНГУ

Пра гэта сведчаць амаль штогадовыя спаборніцтвы атлетаў Віцебшчыны ў Гарадку. Кіраўнік атлетычнага клубу "Арфей" з Гарадка — Сяргей Камлёў — кожны год прыкладае намаганні, каб правесці спаборніцтвы на высокім узроўні. Спаборніцтвы на галоўны прыз заснавальніка бодыбілдынгу у Гарадку Яўгена Ціханравава гэтым разам сабралі 35 атлетаў з вобласці. І нягледзячы на платны уваход зала ГДК была запоўнена поўнасцю. Здаровым быць становіцца модна.

УЗБУЙНЕННЕ ЗМЯНШАЕ МІЛАСЭРНАСЦЬ

Агульнай тэндэнцыяй развіцця сельскай гаспадаркі раёна стала — узбуйненне былых калгасаў праз далучэнне да ААТ "Райаграпрамзабеспячэнне", ААТ "Льназавод". І калі раней у раёне было амаль трыццаць гаспадарак — калгасаў, саўгасаў, то зараз не набіраецца і дваццаць. Але не ўсе узбуйненныя гаспадаркі захоўваюць сацыяльныя льготы для сваіх працаўнікоў. Асабліва гэта датычыцца ААТ "Райаграпрамзабеспячэнне", якое зараз распараджаецца амаль 25% зямель раёну. Пры пахаванні былых калгаснікаў, у тым ліку і ветэранаў вайны, кіраўніцтва прадпрыемства выстаўляе родзічам рахунак за транспарт больш 70 тысяч рублёў. І гэта тым людзям, якія сваё жыццё аддалі абароне і працы на зямлі!

ДЫРЭКТЫВА НЕ СПРАЦАВАЛА

Дырэктыва №1 аб узмацненню адказнасці за стан парадку ў краіне не спрацоўвае, калі няма сродкаў для мадэрнізацыі, рамонту старых памяшканняў, старога абсталявання. Менавіта ад гэтага — наяўнасці старой электраправодкі, якая можа сапсавацца ў любы момант, хутчэй за ўсё і адбыўся пажар у аптэцы г. Гарадка напярэдадні свята Перамогі. Асноўная версія пажару — ўзгаранне старой лядоўні. Персаналу аптэкі прышлося прыкласці шмат здароўя і намаганняў, каб хутка аднавіць працу жыццёва важнай для гарадчан установы. Дзякуй!

КОЛАДЗЁН

Травень прайшоў пад знакам святкавання 60-годдзя перамогі і заліўных халодных дажджоў, якіх было вельмі багата. Адметным знакам месяца магчыма таксама лічыць і узрастанне праследу іншадумцаў у краіне: распачаўся працэс над Міколай Статкевічам і Паўлам Севярынцам, якія былі ў першых шэрагах нязгодных з вынікамі сумнавядомага кастрычніцкага рэферэндума; чарговыя судовыя прэтэнзіі выказаны да газеты "Народная воля"; адбыліся выключэнні з навучальных устаноў актывістаў "Маладога фронту" у Жодзіна і адпаведная галадоўка пратэсту моладзі; пачаўся судовы працэс супраць рэдактара незалежнай газеты "Барысаўскія навіны" Анатоля Букаса; папярэджана кіраўніцтва партыі БНФ аб хуткім высяленні з офісу на Варвашэні. Усё гэта укладваецца ў пэўную логіку дзеянняў уладаў — падаўляць усе кропкі іншадумства, запалохваць грамадства.

І таксама лейтматывам гучалі уладныя запэўненні аб тым, што на Беларусі рэвалюцыі не будзе. Гэтыя запэўненні гучалі так часта, што склалася уражанне, што улады вельмі запалоханы развіццём падзей на постсавецкай прасторы. Самым галоўным ворагам аднaзначна выдаваліся ЗША. У гэтым кантэксце сапраўднай "вуткай" выглядае паведамленні СМІ канца красавіка аб магчымай сустрэчы Лукашэнкі і Буша у Маскве 9 мая. Між тым справа дайшла да таго, што Аляксандра Лукашэнкі не аказалася на святочным парадзе ў Маскве, дзе былі кіраўнікі больш 50 краін свету. Вось і кажы пасля гэтага, што мы разам з расіянамі і украінцамі вынеслі галоўны цяжар Айчынай вайны. Тым больш, што ў прамове Пуціна наша краіна і не ўзгадвалася.

Травень стаў таксама месяцам працягу працы па дабраўпарадкаванню на зямлі. Вядзецца гэта праца з паказушных мэтаў — як мы будзем выглядаць перад семінарыстамі. І наводзіцца парадак на трасах праезду экскурсантаў. Між тым людзі паспалітыя жадаюць перш за ўсё нармальнага праезду да сваіх дамоў і справядлівага укладання сродкаў у рамонты вуліц, дарог, дамоў. Толькі ў бюракратычным рэі галасы простага люду не чуваць — яго інтарэсы пераважна прадстаўляюць звычайныя чыноўнікі, што пад каўпаком у кіраўніка вертыкалі. А як вертыкаль кіруе, магчыма даведацца з падборкі матэрыялаў з Віцебшчыны аб якіх распавядала на радыё "Свабода" Браніслава Станкевіч.

Леанід Гаравы.

АНАТОЛЬ ЛЯБЕДЗЬКА: ЗЬВЕСТКІ ПРА ЗБРОЮ АПАЗЫЦЫІ – ГЭТА ЧАРГОВАЯ ПРАВАКАЦЫЯ

Алег Грузьдзіловіч, Менск. *"Чарговай правакацыяй" назваў лідэр АГП Анатоль Лябедзька кампанію, якую разгарнулі дзяржаўныя мэдыі вакол зброі, якую знайшлі пад Менскам і Берасьцем. Між тым, афіцыйныя крыніцы ў міліцыі і КДБ гэтых зьвестак не пацьвярджаюць.*

У Міністэрстве ўнутраных справаў дагэтуль не пацьвердзілі зьвестак, якія распаўсюдзіла агенцтва "Інтэрфакс" 13 траўня адносна магчымай прыналежнасьці зброі, знойдзенай пад Менскам і Берасьцем.

Паводле "Інтэрфаксу", пра тое, што зброя, магчыма, належыць апазыцыі, нібыта паведамілі сьледчыя зь міліцыі, якія расьсьледуюць крымінальныя справы. Між тым, і сёньня, 16 траўня, у прэсавай службе МУС не пацьвердзілі гэтых падазрэньняў.

"Самі факты ёсьць, яны расьсьледуюцца, але прывязваць гэта да апазыцыі... У мяне пакуль няма зьвестак, чыя гэтая зброя", — сказаў супрацоўнік прэсавай службы МУС Віктар Новікаў.

Кіраўнік цэнтру сувязяў з грамадзкасьцю КГБ Валер Надтачаеў таксама не сьпяшаецца з высновамі. Ён заявіў Радыё Свабода, што справы яшчэ не расьсьледаваныя, таму немагчыма казаць пра прыналежнасьць знойдзенай зброі.

Між тым, беларускія дзяржаўныя мэдыі ўжо некалькі дзён паведамляюць пра тое, што беларуская апазыцыя нібыта завезла ў краіну зброю. Дзяржаўнае тэлебачаньне ілюструе гэтыя заявы кадрамі, на якіх дэманструюцца вялізныя арсэналы. Пры гэтым спасылаюцца на зьвесткі, распаўсюджаныя агенцтвам "Інтэрфакс".

Я спытаўся кіраўніка беларускага бюро "Інтэрфаксу" Вячаслава Зяньковіча, ці можа ён назваць крыніцы, якія б пацьвердзілі зьвесткі ананімных сьледчых МУС. Вячаслаў Зяньковіч адмовіўся размаўляць, спаслаўшыся на забарону начальства.

Старшыня Беларускай асацыяцыі журналістаў Жанна Літвіна мяркуе, што ў Беларусі распачатая чарговая кампанія ачарненьня апазыцыі, а некаторым журналістам загадана яе абслугоўваць. Між тым, Жанна Літвіна не здымае адказнасьці і са сваіх калегаў.

(Літвіна:) "Усё залежыць ад сумленьня. Калі сеў перад мікрафонам ці тэлекамэрай, рыхтуеш інфармацыю і перадаеш яе рэдактару — у першую чаргу трэба кіравацца сумленьнем. Каля яго няма, тады няма... Тады пакутуе грамадзтва".

Лідэр Аб'яднанай грамадзянскай партыі Анатоль Лябедзька лічыць, што міліцыя ці КДБ маглі б лёгка высьветліць, каму належыць знойдзеная зброя, запісаўшы на відэа тых, хто карыстаецца сховамі зброі. Тое, што гэтага не было зроблена, на думку Анатоля Лябедзькі, пацьвярджае правакацыю супраць апазыцыі.

(Лябедзька:) "У гэта могуць верыць толькі пэнсіянэры. Бо пасьля таго, што ім паказалі на гэтыя выходныя, яны пайшлі ў аптэку купляць валідол.".

СУД НЕ ЗАДАВОЛІЎ ПАТРАБАВАНЬНЯЎ ПРЫЗНАЦЬ НЕЗАКОННАЙ ЗАБАРОНУ МІТЫНГА ГАРВЫКАНКАМАМ

Спачатку выканкам дазволіў, а потым забараніў правядзеньне мітынгу супраць падвышэньня камунальных плацяжоў, увядзеньня прымусовых кантрактаў. Спаслаўся на тое, што арганізатары парушылі закон пра масавыя мерапрыемствы — расклеілі ў горадзе абвесткі пра мітынг яшчэ да атрыманьня дазволу. Абвесткі да таго ж нібыта не адпавядалі замоўленай мэце мітынгу і выпушчаны былі з парушэньнем закону пра друк ды іншыя сродкі масавай інфармацыі.

Судзьдзя Віктар Казачок у сваім рашэньні па сутнасьці паўтарыў матывы гарвыканкаму на забарону мітынгу.

Юрыст Аляксандар Лашук, які назіраў за судовым працэсам, лічыць рашэньне суду неабгрунтаваным:

(Лашук:) "Матывацыі ў суду няма ніякай. Ніхто не ўстанавіў факту парушэньня закону з боку арганізатараў мітынгу. Па-другое, санэпідэмстанцыя сапраўды прымала пастанову наконт грыпу, але ніводнае мерапрыемства ў той час не было адменена. Відавочна, што ніякіх прававых абгрунтаваньняў не дазваляць мітынг гарвыканкам ня меў. А гэта азначае, што і цяперашняе рашэньне суду ня мае пад сабою ніякіх юрыдычных падставаў".

Казімер Яноўскі.

АПОШНІ ШУМНЫ ЮБІЛЕЙ

СССР не любіў успамінаць пра сваю віну перад народам. Але мы павінны нястомна нагадваць і пра «Мы за ценой не постоим», і пра «новы Берасьцейскі мір», які Сталін хацеў заключыць з Гітлерам.

Піша Анатоль Сідарэвіч.

З 60-годзьдзя завяршэньня Другое сусьветнае вайны яны выціснулі ўсё, што маглі. Хлусілі не чырванеючы. Што ні тэзіс, то стары прапагандысцкі штамп. А галоўныя тэзісы былі: на змаганьне ўстаў увесь савецкі народ; вайна згуртавала народы Савецкага Саюзу; Савецкі Саюз адзін перамог Нямеччыну.

Як увесь савецкі народ устаў на змаганьне з нацыстамі, сьведчыць адна лічба: у гітлераўскіх вайсковых структурах кожны пяты быў з савецкіх грамадзян.

Як вайна згуртавала народы СССР, мы ведаем з гісторыі высылак немцаў Паволжжа, чачэнцаў, калмыкаў, крымскіх татар... З гісторыі масавых дэпартацый насельніцтва Балтыі і Заходняе Украіны. З гісторыі масавых уцёкаў на Захад мільёнаў людзей зь Беларусі, Дону, Кубані...

Сьцьвярджаць, што СССР перамог Нямеччыну, можа толькі той, хто нічога ня чуў пра лэнд-ліз, Аб'яднаныя Нацыі і Другі фронт. І адкрыўся ён ня ў чэрвені 1944 году ў Нармандыі, як пішуць у падручніках, а ў час бітвы пад Сталінградам: тады брытанцы пачалі бамбардзіроўкі Нямеччыны, а разам з амэрыканцамі — бітву за Паўночную Афрыку. У ліпені 1943-га (ішла Курская бітва) яны былі на Сыцыліі. А праз два месяцы Італія капітулявала, і Гітлер мусіў накіроўваць на Апэнінскі паўвостраў не адну дывізію.

Разумеючы фальшывасьць тэзісу «СССР перамог Нямеччыну», яны спрабуюць падмяніць яго яшчэ адным фальшывым тэзісам: «Савецкі Саюз зрабіў самы важкі ўклад у перамогу над Нямеччынай». На якіх вагах гэта ўзважана і якім мэтрам гэта зьмерана? Мусіць, колькасьцю палеглых на той вайне. Але гэта вынік бяздарнае палітыкі сталінскага кіраўніцтва, якое аддало немцам тэрыторыю ад Беластоку да Сталінграду (гнілая царская Расея далей як у Баранавічы іх не пусьціла). Гэта вынік бесчалавечных мэтадаў вядзеньня вайны. СССР так і ня змог палічыць усіх палеглых і замучаных. Ці гэта не адзнака зьняважлівага стаўленьня да чалавечага жыцьця?

Сталінскія маршалы («Мы за ценой не постоим») клалі на адным квадратным кілямэтры вызваленае тэрыторыі гэтулькі салдатаў, як ніводная армія сьвету. А мільёны палонных у першыя месяцы вайны? А панішчаныя заградатрадамі? А забітыя і спаленыя энкавэдыстамі мірныя жыхары Беларусі і Украіны? А мільёны эмігрантаў, якіх таксама запісалі ў нябожчыкі?

Сёлета быў апошні ўсплёск бальшавіцкага патрыятызму. Зрэшты, ён закрануў толькі вярхі грамадзтва і толькі частку ўдзельнікаў вайны. Чым далей ад сталіцы, тым менш было шуму і чаду. Сотні тысяч грамадзян, не мабілізаваных на ўрачыстасьці, былі занятыя іншым. Яны пазіралі на неба і ўслухоўваліся ў мэтэапрагнозы: ці хоць пацяплее, ці можна сеяць і садзіць на лецішчах і гародах?

Халодная вясна паказала, што наша краіна яшчэ ня выйшла з эпохі натуральнае гаспадаркі, што заробкаў на годнае жыцьцё не хапае. За 60 паваенных гадоў мы так і не дасягнулі галоўнае перамогі — над беднасьцю.

Настае час разьвітаньня з ваенным пакаленьнем, якому дзяржава так і не сплаціла даўгі. Застануцца тыя, перад кім дзяржава вінаватая найбольш. Гэта дзеці вайны. Тыя, каго Сталін і начальнік генштабу Жукаў здалі пад уладу нацыстаў. Тыя, хто жыў у зямлянках і карміў вошы, хто цягаў на сабе плугі і бароны, каб не памерці з голаду... Ім належаць мэдалі за пакуты.

СССР і ягоныя спадкаемцы не любілі і ня любяць успамінаць пра сваю віну перад народам. Але мы павінны нястомна нагадваць і пра тых, хто давёў да Беластоцкага катла, да Сеньненскай катастрофы бранятанкавых войскаў, да Трасьцянца і гета... І пра тое, як Сталін хацеў заключыць з Гітлерам «новы Берасьцейскі мір» ды здаць Беларусь Нямеччыне. Калі наша грамадзтва будзе памятаць і думаць найперш пра гэта, тады сапраўды Беларусь стане дзяржаваю для народу Беларусі.

Анатоль Сідарэвіч, "Наша Ніва".

ДЖОРДЖ БУШ: "АДЗІНАЯ ЗЬДЗЕЛКА, ЯКУЮ Я ЛІЧУ НЕАБХОДНАЙ ДЛЯ БЕЛАРУСІ – ГЭТА ЗЬДЗЕЛКА СВАБОДЫ"

Юры Сьвірко, Рыга. **Падчас знаходжаньня ў Рызе прэзыдэнт ЗША абмеркаваў са сваімі балтыйскімі калегамі сярод іншых пытаньняў сытуацыю ў Беларусі. Перад прыездам у Маскву Джордж Буш паведаміў, што будзе гаварыць пра Беларусь з прэзыдэнтам Расеі Уладзімерам Пуціным.**

Зьвяртаючыся да прэзыдэнтаў трох краін Балтыі, якія разам зь ім давалі прэсавую канфэрэнцыю, Джордж Буш сказаў:

(Буш:) "Мы мелі сапраўды добрую дыскусію наконт Беларусі. Мы гаварылі пра Украіну, Грузію, Малдову. Мы гаварылі пра Расею, стасункі паміж Балтыяй і Расеяй".

Першае пытаньне на прэсавай канфэрэнцыі задаў Джорджу Бушу карэспандэнт Літоўскага тэлебачаньня, і яно гучала так: "Адносна таго, што Вы заявілі нядаўна: што дэмакратычная Беларусь – таксама ў інтарэсах Расеі. Ці можа быць зьдзелка паміж Вашынгтонам і Масквой, што Расея забясьпечыць непераабраньне прэзыдэнта Лукашэнкі ў наступным годзе, а Вашынгтон, у сваю чаргу, будзе заахвочваць і хваліць дэмакратыю там, але заплюшчыць вочы на працяг расейскага ўплыву там?"

Вось што адказаў прэзыдэнт ЗША:

(Буш:) "Цікавае пытаньне – ці можна заключыць зьдзелку, каб вызначыць чыйсьці лёс? Я думаю, гэта тое, што мы асуджаем сёньня – тое, што адбылося з Балтыяй, тыя таемныя зьдзелкі паміж вялікімі дзяржавамі, што прадпісвалі народам нейкі спосаб кіраваньня. Мы не зьбіраемся рабіць таемныя зьдзелкі. Адзіная зьдзелка, якую я лічу неабходнай тут для людзей – гэта зьдзелка свабоды. Ім трэба дазволіць выказвацца на свабодных, адкрытых і справядлівых выбарах у Беларусі. Што да таго, у інтарэсах Расеі або не мець дэмакратыю на сваёй мяжы – абсалютна, гэта ў інтарэсах Расеі, каб яна мела сябрамі й суседзямі дэмакратыі".

Джордж Буш дадаў, што ЗША пашанцавала мець дэмакратыі на сваіх межах, хаця па нейкіх пытаньнях зь імі не заўсёды ёсьць згода.

РЫГОР БАРАДУЛІН: ЛУКАШЭНКА НЯ МОЖА ТРЫВАЦЬ, ШТО КОЖНЫ ДЗЕНЬ ЕЗЬДЗІЦЬ У ДРАЗДЫ ПА ПРАСПЭКЦЕ МАШЭРАВА, А НЕ ПА СВАІМ

Севярын Квяткоўскі, Менск. Праспэкт Скарыны – на праспэкт Незалежнасьці, праспэкт Машэрава – на праспэкт Пераможцаў. Старабарысаўскі тракт назавуць вуліцай Скарыны, вуліцы Варвашэні, Ерусалімская і Дразда стануцца праспэктам Машэрава, а для вуліцаў падшукаюць новыя адрасы. Вось сутнасьць указу, падпісанага Аляксандрам Лукашэнкам. Як паставіліся да гэтых зьменаў менчукі?

Народны паэт Беларусі Рыгор Барадулін перакананы, што асноўная прычна перайменаваньня галоўных праспэктаў зьвязаная з амбіцыямі кіраўніка краіны:

(Барадулін:) «За гэтым стаіць у нашага часовага прэзыдэнта проста неадольная прага бачыць сябе на белым кані. Ён ня можа трываць, што кожны дзень езьдзіць у Дразды па праспэкце Машэрава, а не па сваім. Ён падсьпудна думае, што праспэкт Пераможцаў – гэта значыць яго».

Таварыства беларускай мовы – тая грамадзкая арганізацыя, якая пастаянна прапаноўвае перайменаваньне цэнтральных вуліц Менску на гонар нацыянальных герояў. Старшыня ТБМ Алег Трусаў камэнтуе захады ўладаў:

(Трусаў:) «Казалі, што няма грошай, што трэба дбаць пра пэнсіянэраў, вэтэранаў, інвалідаў. Цяпер грошы знойдзеныя – з нашай з вамі кішэні. І велізарныя сумы будуць кінутыя на вецер. Бо памяняць напрыклад Францыска Скарыны – гэта шалёныя грошы».

Калі два гады таму да менскіх уладаў зьвярнуліся з просьбай назваць адну з цэнтральных вуліцаў імем Быкава, паступіла адмова. Маўляў, новыя назвы будуць зьяўляцца толькі ў новых мікрараёнах. Працягвае Алег Трусаў:

(Трусаў:) «Мы былі за тое, каб новым вуліцам надаваць імёны нашых герояў. І калі так хацелася перайменаваць, у нас ёсьць вуліца Энгельса, Валадарскага, Леніна, Калініна і г.д. Чамусьці не спадабаўся нават Машэраў. Гэта значыць, што ўлада пачынае мяняць палітыку. І старая савецкая міталёгія ўжо не працуе. І не выпадкова зьявіўся праспэкт Незалежнасьці».

Зрэшты, ёсьць менчукі, якім даспадобы новае рашэньне пра зьмену назваў, але большасьць паставіліся скептычна. Афіцыйныя мэдыі спасылаюцца на вэтэранаў, якія нібыта папрасілі пра перайменаваньні ў прэзыдэнта Лукашэнкі. Але сярод вэтэранаў вайны вядуцца спрэчкі. Асабліва вакол імя Пятра Машэрава:

(Вэтэран:) «Гэта дарма. Праспэкт Пераможцаў патрэбны, але Машэрава ня трэба было чапаць».

НА МЕНСКІ РЭФЭРЭНДУМ АБ ПЕРАЙМЕНАВАНЬНІ ВУЛІЦ ПРАПАНУЮЦЬ ЧАТЫРЫ ПЫТАНЬНІ

Валер Каліноўскі, Менск. *27 траўня адбылося другое паседжаньне грамадзкага аргкамітэту ў справе правядзеньня менскага гарадзкога рэфэрэндуму дзеля перайменаваньня А.Лукашэнкам цэнтральных праспэктаў і вуліц беларускай сталіцы.*



Юрысты падрыхтавалі праекты пратаколу сходу ініцыятыўнай групы, заяваў яе сябраў і звароту ў гарвыканкам. Сход ініцыятыўнай групы мяркуецца правесьці 13 чэрвеня ў памяшканьні, якое павінны даць гарадзкія ўлады.

У праектах гэтых дакумэнтаў прапанавана на менскі гарадзкі рэфэрэндум вынесьці чатыры пытаньні. Першае зь іх гучыць наступным чынам: "Ці лічыце вы неабходным вярнуць ранейшую назву праспэкту Ф.Скарыны, які ў адпаведнасьці з указам прэзыдэнта Рэспублікі Беларусь ад 7 траўня 2005 году за нумарам 216 быў перайменаваны ў праспэкт Незалежнасьці?" Астатнія тры пытаньні датычацца адпаведна праспэкту Машэрава, Старабарысаўскага тракту ды вуліц Варвашэні, Ерусалімскай і Дразда (апошнія тры разам былі перайменаваныя А.Лукашэнкам у новы праспэкт Машэрава).

Кіраўнік аргкамітэту Сяргей Альфер неабходнасьць чатырох пытаньняў на рэфэрэндуме патлумачыў юрыдычнымі патрабаваньнямі, каб пытаньні, што выносяцца на ўсенароднае абмеркаваньне, былі яснымі і адназначнымі. Зь іншага боку, гэта "этрэбна і для зручнасьці выбаршчыкаў, зазначыў спадар Альфер.

Аднак праблема не ў заканадаўчым рэгуляваньні, а ў жаданьні ўлады прызначыць мясцовы плебісцыт.

Сяргей Альфер ад імя аргкамітэту запрасіў на паседжаньне ініцыятыўнай групы прадстаўнікоў менскіх гарадзкіх уладаў.

ПРАКУРОР ПАПРАСІЎ ДАЦЬ ПА 3 ГАДЫ "ХІМІІ" ЛІДЭРАМ АПАЗЫЦЫІ

Любоў Лунёва, Менск. *Тры гады абмежаваньня волі з адбыцьцём пакараньня на так званай "хіміі" — такое пакараньне папрасіў абвінаваўца для Міколы Статкевіча і Паўла Севярынца. Суд над апазыцыйнымі палітыкамі цягнецца з 23 траўня. Іх абвінавачваюць у арганізацыі вулічных дэманстрацыяў 18 і 19 кастрычніка, у часе якіх нібыта адбываліся масавыя беспарадкі. 24 траўня Міколу Статкевіча арыштавалі на дзесяць сутак за непавагу да суду, бо ён адмовіўся адказваць на пытаньні судзьдзі і ўставаць перад ім. На знак пратэсту апазыцыянэр трымае галадоўку.*

Прамову прадстаўніка пракуратуры Вадзіма Пазьняка, які папрасіў пакараць Міколу Статкевіча і Паўла Севярынца абмежаваньнем волі на тры гады, Мікола Статкевіч не пачуў. Яго, як і штодня ад пачатку арышту, прывезьлі ў суд а 10 гадзіне. Ён зноў адмовіўся ўстаць перад судзьдзём Леанідам Ясіновічам, і аманаўцы зноў вывелі яго з судовай залі.

Мікола Статкевіч заявіў Радыё Свабода, што будзе і надалей трымаць галадоўку.

(Статкевіч:) "Безумоўна, цяпер у мяне пытаюцца адно і тое ж. Але пакуль у Беларусі ня зьявіцца незалежнага суду, мая пазыцыя таксама не зьменіцца. Я працягваю галадоўку, і я галадоўкі спыняць ня буду. Я сваёй пазыцыі не мяняю. Адзінае, чаго мне ўдалося дамагчыся: хворага на дызэнтэрыю чалавека, які знаходзіўся ў маёй камэры, адправілі ў шпіталь. Калі мне судзьдзя скажа, што ў гэтай краіне зьявіўся незалежны суд, то я спыню галадоўку. Але гэта нерэальна".

Павал Севярынец спакойна ўспрыняў прамову прадстаўніка пракуратуры. Вось як ён пракамэнтаваў гэта Радыё Свабода:

(Севярынец:) "Тры гады "хіміі", гэта адначасова і спроба прынізіць, і спроба нэўтралізаваць перад прэзыдэнцкімі выбарамі 2006 году як Статкевіча, так і мяне. Але стаўлюся да гэтага спакойна. Турбуе мяне суд Божы, а не чалавечы. Тым больш ня суд гэтай улады. Таму, які б прысуд ні быў, захаваем маральную гатоўнасьць да ўсіх магчымых складанасьцяў, з гэтым зьвязаных. Але ж хацеў бы зазначыць: падчас судовага разгляду гэтай справы стала відавочна, што крымінальная справа развальваецца. Пракурор пачаў адмаўляцца ад кавалкаў абвінавачаньня, казаць: "Ну, ня цяжкае злачынства. Цяжка патрабаваць зьняволеньня". Па ўсіх яго паводзінах было відаць, што ён шкадуе аб тым, што не ўдалося знайсьці крыміналу ў гэтай справе".

Агалошваньне прысуду адбудзецца 31 траўня.

P.S. Суд прызначыў лідэрам апазыцыі тры гады «хіміі».

У ЗАХОДНІХ РАЁНАХ ВІЦЕБШЧЫНЫ АД ХОЛАДУ ЗАГІНУЛІ ВЫГНАНЫЯ НА ПАШУ КАРОВЫ

Браніслава Станкевіч, Віцебск. **Загады выганяць кароў у поле з 9-га траўня паступілі ад раённага начальства, і ў гаспадарках мусілі падпарадкавацца, нягледзячы на тое, што на Мёршчыне тэмпература зьнізілася да 0 градусаў, а ў Шаркоўшчынскім раёне ўвогуле пайшоў сьнег. Цяпер там падлічваюць страты: паводле папярэдніх зьвестак, у кожным з раёнаў загінулі больш як па тры сотні кароў ды цялушак.**

Нечаканае пахаладаньне ўдзень 10-га траўня ў Мёрскім раёне лічаць галоўнай прычынаю таго, што ў 5-ці гаспадарках загінулі 360 галоў быдла.

Словам "загінулі" абагульняецца ўсё, што здарылася тут у апошнія суткі – і тое, што, ратуючыся ад ветру і дажджу, цялушкі туліліся адна да адной і насьмерць душылі слабейшых, і што аслаблыя за зіму каровы пасклізаліся і танулі ў перапоўненых вадой канавах, і што нават пасьля таго, як жывёлу загналі пад дах, частка дойнага статку загінула ад вострых запаленьняў.

Страты раённай сельскай гаспадаркі пакуль не падлічаныя, бо некаторую частку яшчэ жывых кароў пасьпелі адправіць на Мёрскі мясакамбінат, дзе так званы "убойны" цэх працаваў усю ноч навылёт. Сюды ж быў выклікаены і намесьнік раённага пракурора Аляксей Лапушынскі, які праводзіць тут праверку, бо факты масавага падзяжу жывёлы сталі вядомыя толькі дзякуючы таму, што супрацоўнік службы ДАІ выпадкова спыніў прычэп з памерлымі цялушкамі. Па выніках праверкі прадстаўнік Мёрскай пракуратуры пакуль нічога не кажа.

Кіраўнік Шаркоўшчынскага райсельгасхарчу Іван Лаўрановіч сцвярджае, што кароў ды цялушак ў гаспадарках гэтага раёну таксама загубіла выключна надвор"е.

(Лаўрановіч:) " Ліў тут дождж, 56 міліметраў за суткі – гэта больш як месячная норма. Паніжэньне тэмпературы было ноччу і сьнег, сьнег ішоў пяць гадзін."

(Карэспандэнтка:) " А чаго ж кароў пагналі на пашу ў такое надвор"е?"

(Лаўрановіч:) "Дык усе гады выганяем такім часам, і праблем не было! А тут вось так атрымалася."

Паводле словаў Івана Лаўрановіча, у Шаркоўшчынскім раёне страцілі толькі каля сарака кароў, і тое іх нібыта пасьпелі яшчэ жывымі адвесьці на мясакамбінат у Глыбокае. Хаця супрацоўнікі толькі аднаго аграпрадпрыемства "Княж" ананімна кажуць, што ў іх загінулі 87 кароў і 40 цялушак, і вінавацяць у гэтым толькі раённае начальства, якое аддала загад пра пашавае ўтрыманьне жывёлы.

Гаварыць пра маштабы стратаў усяе Віцебшчыны чыноўнікі абласнога рангу адмаўляюцца. Так, намесьнік старшыні аблсельгасхарчу Віктар Славецкі параіў журналістам не ўзьнімаць дарма паніку, бо, паводле ягоных словаў, на захадзе Віцебшчыны нічога надзвычайнага не адбылося – ніводная карова не замерзла і ідзе ўсяго толькі плянавая здача быдла на мясакамбінаты.

НА ВІЦЕБШЧЫНЕ ЗАВЕДЗЕНЫЯ ДЗЬВЕ КРЫМІНАЛЬНЫЯ СПРАВЫ СУПРАЦЬ ЧЫНОЎНІКАЎ

Браніслава Станкевіч, Віцебск **Намесьнік старшыні Браслаўскага райвыканкаму падазраецца ў злоўжываньні службовым становішчам, а начальнік аўтамабільнага пункту пропуску "Рэдзькі –Ляды", што знаходзіца ў Дубровенскім раёне, на мяжы з Расеяй, знаходзіцца пад сьледзтвам за атрыманьне буйнога хабару.**

Намесьнік старшыні Браслаўскага райвыканкаму, які ёсьць аднапачасова і дэпутатам райсавету, быў упаўнаважаны кіравацьвыкананьнем праграмы будаўніцтва на сяле – ўзьвядзеньнем так званых "прэзыдэнцкіх" дамкоў.

Абласная пракуратура завяла супраць яго крымінальную справу за тое, што ён загадваў сваім падначаленым прымаць у якасьці гатовых незавершаныя аб"екты, як сказана ў афіцыйнай фармулёўцы пракурора, " з мэтаю даць станоўчую справаздачу пра выкананьне высокіх паказьнікаў".

Пракуратура лічыць, што ён нанёс істотную шкоду дзяржаве, бо сваімі злоўжываньнямі "падрываў аўтарытэт і прэстыж дзяржаўнае ўлады". Паводле адпаведнага артыкулу Крымінальнага кодэксу, за гэта чыноўніку пагражае тэрмін зьняволеньня ад 3-х да 10-ці гадоў.

СЯРОД ДЭМАКТЫВІСТАЎ ВІЦЕБШЧЫНЫ НАЙБОЛЬШ ГАЛАСОЎ АТРЫМАЎ МІЛІНКЕВІЧ

Абласную канфэрэнцыю ў справе вылучэньня адзінага кандыдата ад дэмакратычных сілаў было вырашана правесьці ў лесе пад Віцебскам, бо правесьці такую імпрэзу ў горадзе тутэйшыя актывісты палічылі немагчымым.

Аднак віцебская міліцыя знайшла апазыцыянэраў і там. На ціхіх вулачках прыгараду наўрад ці бачылі калі-небудзь такую колькасьць міліцэйскіх машын, як сёньня, і дэлегатаў канфэрэнцыі ў лесе сустрэлі каля двух дзесяткаў міліцыянтаў – з Віцебскага раённага і абласнога аддзелаў. Начальнік абласнога аддзела аховы правапарадку Сяргей Іваноў зьвярнуўся спачатку да прэтэндэнта Анатоля Лябедзькі, які прыехаў на канфэрэнцыю першым, з тым, каб усім прысутным было загадана разысьціся, але Анатоль адмовіўся гэта выконваць.

Калі міліцыянты папярэдзілі, што арыштуюць кожнага, хто будзе выступаць з прамовамі, да нечага заклікаць або нават проста засьпявае песьню "неадпаведнага зьместу", арганізатары канфэрэнцыі прапанавалі іншы фармат яе правядзеньня. 109 дэлегатаў падзяліліся на чатыры групы, да якіх па чарзе падыходзілі чацьвёра прысутных прэтэндэнтаў на вылучэньне: Сяргей Калякін, Анатоль Лябедзька, Аляксандар Мілінкевіч і Станіслаў Шушкевіч. Яны адказалі на пытаньні і падзяліліся сваімі плянамі.

Галасаваньне таксама праводзілася незвычайным чынам. Калі галасы падлічылі, то высьветлілася, што найбольшым даверам у прадстаўнікоў дэмакратычнае грамадзкасьці Віцебшчыны карыстаецца Аляксандар Мілінкевіч, ён набраў 68 галасоў. За Сяргея Калякіна прагаласавалі 53 чалавекі, за Анатоля Лябедзьку – 46, за Мікалая Статкевіча –39, за Станіслава Шушкевіча –27, за Мікалая Бусьнюка – 21, за Валерыя Арцішэўскага і Валерыя Грыцука – па 9 чалавек.

АНЖАЛІКА АГУРБАШ ФІНІШАВАЛА СЯМНАЦЦАТАЙ



Ігар Карней, Менск **Мільённыя выдаткі на падрыхтоўку да "Эўрабачаньня-2005" ня мелі для беларускай удзельніцы Анжэлікі Агурбаш плёну. Агурбаш паводле вынікаў глядацкага галасаваньня не ўвайшла ў дзясятку лепшых і такім чынам завяршыла ўдзел у конкурсе сямнаццатай. Летась беларускі дуэт "Аляксандра і Канстанцін" у паўфінале быў перадапошні.**

Яшчэ напярэдадні ад'езду ў Кіеў Анжаліка Агурбаш гаварыла, з кім зьбіраецца падзяліць "радасьць перамогі":

(Агурбаш:) "Ня я еду на "Эўрабачаньне", уся краіна едзе. За мной 10-мільённы народ, які мяне любіць, за мной урад, які дапамагае і ўсё робіць, каб мы максымальна наблізіліся да перамогі. Мы за цаной не пастаім: зробім усё магчымае і, самае галоўнае, немагчымае, каб найлепшым чынам паказаць сябе і зрабіць усё, каб наступнае "Эўрабачаньне" прайшло ў Менску".

Адносна ўчорашняга выступу Анжалікі Агурбаш былая тэлевядучая Элеанора Язерская наўпрост кажа: Агурбаш пераблытала сцэну з подыюмам.

(Язерская:) "Калі я пачула яшчэ месяц назад яе песьню, я сказала: нічога ў Агурбаш не атрымаецца. Мне было вельмі сумна так думаць, таму што я ўвогуле добра стаўлюся да Анжалікі. Яна прыгожая жанчына, артыстычная. Але на "Эўрабачаньні", перш за ўсё, трэба сьпяваць, а не дэманстраваць дарагі касьцюм. Гэтая сукенка, якую шыў хвалёны Юдашкін, на мяне не зрабіла ніякага ўражаньня. За што такія грошы? — пэўна, пра гэта думала ня я адна. Песьня для мяне таксама не цікавая. Такіх песень цяпер процьма. Дарэчы, удзельніца з Грэцыі ад гэтай песьні адмовілася.Чаму ўзяла яе Анжаліка? Мабыць, такія былі ў яе настаўнікі".

Цягам усяго папярэдняга тыдня Анжаліку Агурбаш суправаджала выключна расейская "сьвіта": Усе гэтыя людзі ня першы раз прывозяць расейскіх выканаўцаў на "Эўрабачаньне" (досыць згадаць тых жа Кіркорава і Пугачову) і кожны раз аказваюцца па-за бортам спаборніцтваў. Элеанора Язерская перакананая: у выпадку, калі лепшых вызначаюць звычайныя гледачы, стаўка на вялізныя і "ўсемагутныя" грошы не апраўданая.

(Язерская:) "Паездкі па дваццаці шасьці краінах Эўропы, што арганізаваў яе прад'юсар Філіп Кіркораў — гэта яшчэ ня ўсё. Патрэбен добры песенны матэрыял, створаны ў сваёй краіне, і больш прадуманая падрыхтоўка. З Анжалікай Агурбаш адбыўся цікавы, на ўсю Эўропу, эксперымэнт. Ці можна за вельмі вялікія грошы (раскрутка пацягнула дзесьці на 4 мільёны даляраў) стаць зоркай "Эўрабачаньня"? Аказваецца, немагчыма. А наагул, вельмі сумна".

Як адзначаюць музычныя крытыкі, паводле размаху рэклямнай кампаніі беларускі штаб Агурбаш апярэдзіў усіх астатніх. Дзеля таго, каб аблашчыць публіку, выдалі мільёны асобнікаў кампакт-дыскаў, касэтаў, бэйсболак і маек з выявай беларускай канкурсанткі.

Юры Падольскі, бацька і прад'юсар яшчэ адной беларускі, Натальлі Падольскай, якая выступіць у фінале за Расею, перакананы: адказнасьць за паразу Агурбаш мусіць падзяліць ня толькі яе атачэньне, але і высокапастаўленыя чыноўнікі ад культуры:

Радыё "Свабода"

У НАРОЎЛІ ВЫСЯЛЯЮЦЬ НЕПЛАЦЕЛЬШЧЫКАЎ КАМУНАЛЬНЫХ ПАСЛУГАЎ

Казімер Яноўскі, Нароўля. **У заражанай радыяцыяй Нароўлі мясцовыя ўлады распачалі змаганьне зь неплацельшчыкамі за камунальныя паслугі. У раённы суд пададзены дзясяткі пазоваў на прымусовае спагнаньне доўгу. Многім жыхарам адключылі ваду. Некаторыя людзі з добраўпарадкаванага жытла перасепены ў "маласямейкі".**

Паводле зьвестак жыльлёва-камунальнага прадпрыемства "Нароўля", больш як 800 жыхароў райцэнтру маюць цяпер запазычанасьць за карыстаньне жытлом ды камунальнымі паслугамі. Ня выплачана агулам 126 мільёнаў рублёў. Гаворыць кіраўнік юрыдычнай службы камунальнага прадпрыемства Галіна Сергіенка:

(Сергіенка:) "36 пазоваў мы афіцыйна падалі ў суд на спагнаньне даўгоў за кватрплату. Сем пазоваў падрыхтавана ў мяне на высяленьне. Чатыры нашыя пазовы на высяленьне ўжо задаволілі сёлета".

Гутару з пэнсіянэркай Вольгай Спаскай. Рашэньнем суду за няўплату яе з дачкой-інвалідам з кватэры ў катэджы на вуліцы Мэліяратараў перасяляюць у камунальную аднапакаёўку на вуліцу Корзуна. Спадарыня Спаская ўжо пакавала клункі:

(Спаская:) "Хата ў мяне непаганая, цёпленька тут. Але цяжка адной. Сто зь лішкам тысяч плаціць за кватэру — пэнсіі не хапае. Газ пакуль не адключылі, а вады ў мяне даўно няма. Тры гады, як ваду адключылі. Цяжка! Пэнсію атрымаю і буду пераяжджаць".

Асноўныя неплацельшчыкі ў Нароўлі — жыхары так званых "чарнобыльскіх дамоў", перасяленцы з заражаных радыяцыяй вёсак, а таксама адзінокія пэнсіянэры і беспрацоўныя. Сярод неплацельшчыкаў багата і тых хто працуе, але мае мізэрныя заробкі.

(Шугай:) "Кватрплата зімою 120 тысяч, а заробак — 150. Як выплачваць і як жыць зь дзецьмі?" — пытаецца санітарка раённага шпіталю, маці траіх дзяцей Сьвятлана Шугай.

Жыхары Нароўлі абураюцца высокімі камунальнымі плацяжамі, адсутнасьцю гарачай вады.

НУМАРЫ НА ПАМЯЦЬ АБО ЗА ПЛАТУ

Да гэтага прывучвае абанентаў Гарадоцкай АТС адсутнасць новых тэлефонных даведнікаў са снежня 2004 (!) году. Менавіта ў той час адбылася змена нумароў усіх абанентаў тэлефоннай сеткі ў Гарадку. І проста, калі адбылася замена першай лічбы — 2 на 4, але больш пяцісот нумароў змянілі свае каардынаты поўнасцю. Толькі з таго часу яны сталі інкогніта для ўсіх астатніх абанентаў і за даведку пра невядомы нумар трэба плаціць. Ці не цывілізаваней было б выдаць новы тэлефонны даведнік, які адпавядаў бы рэчаіснасці? Тым больш, што папярэдні даведнік даўно стаў рарытэтам.

ДЭСТРУКТЫЎНЫ ШТАТ

Менавіта да такой высновы магчыма прыйсці, калі прачытаеш нататку аднаго са "спецыялістаў" ідэалагічнага аддзела Гарадоцкага райвыканкама, дзе да дэструктыўных сект аднесена рэлігія мармонаў. Спартыўныя аматары зімовых відаў спорту памятаюць, што менавіта ў штаце Юта — сталіца Солт-Лэйк-Сіці, большасць жыхароў якога складаюць мармоны, прайшлі Алімпійскія гульні 2002 году. Гледачы былі уражаны высокай ступенню арганізацыі грамадскага жыцця штата, дзе кепскай справай лічыцца ужыванне алкаголю і цыгарэт, што не ухваляецца рэлігіяй мармонаў. Дзе тут мармонам да нашага злоўжывання алкаголем і цыгарэтамі! Сапраўды дэструктыўны штат.

КУЛЬТУРА ЗА ГРОШЫ

Становіцца ўсё больш папулярнай у Гарадоцкай ЦРБ. Буржуйская выснова — за культуру трэба плаціць — знаходзіць усё больш падцвярджэнняў у беларускім рынкавым сацыялізму. Калектыў бібліятэкі гатоў аказаць наведвальнікам 15 платных паслуг — ад камерцыйнай аплаты кніг да ксеракапіравання. За 2004 год такім чынам бібліятэка перавыканала план платных паслуг на 600 тыс. руб., папоўнішы бюджэт дзяржавы на 10 600 тыс. руб. Толькі вось на заробках бібліятэкараў гэта амаль ніяк не адбілася. А заробкі вельмі мізэрныя.

У ВІЦЕБСКУ «НОВАЯ ХВАЛЯ» МЯНЯЕ ЦЫГАРЭТЫ НА ЦУКЕРКІ

Браніслава Станкевіч, Віцебск

Віцебская суполка "Новая плынь" у незвычайны спосаб павіншавала віцяблянаў з Усясьветным днём здароўя.

Цягам дня маладзевыя актывісты правялі для студэнтаў вышэйшых навучальных установаў горада шэраг віктарынаў, тэмай якіх быў здаровы лад жыцьця. Аўтары самых зьместоўных адказаў атрымалі прызы – аўдыёдыскі з запісамі беларускай музыкі.

Увечары актывісты "Новай хвалі" выйшлі на Пляц Волі, дзе цягам гадзіны прапаноўвалі ахвотным абмяняць цыгарэты на цукеркі. А маленькіх дзетак частавалі гематагенам і вітамінкамі проста так.

«ГАСЦІНЕЦ»
КУПОН БЯСПЛАТНАЙ ПРЫВАТНАЙ АБВЕСТКІ

Запоўніце гэты купон, вышліце па адрасу: 211573, г. Гарадок, Гагарына д. 30Б, кв.16, і мы надрукуем Вашу абвестку (ня больш 15 слоў) бясплатна.

*Тэкст*____________________

Імя і прозвішча________________

Адрас, тэлефон________________

Заснавальнік і рэдактар: ***Леанід Гаравы.***
Адрас: 211573, г. Гарадок, вул. Гагарына , 30Б-16.
Тэл. 8-02139-4-53-33. *E-mail:* haravy@tut.by

Выдадзена пры падтрымцы Віцебскага аддзялення ГА «Фонд імя Льва Сапегі»
Распаўсюджваецца бясплатна. Наклад 290 асобнікаў